# Мода ад Чорнага Тыгра

Як лепш сустрэць чароўныя зімовыя святы? Дзе і з кім іх адзначаць? Якія стравы прыгатаваць? І, у рэшце рэшт, якое адзенне выбраць для сустрэчы 2022 года? Якраз на апошняе з многіх хвалюючых пытанняў дапаможа знайсці адказ цыкл лекцый «Сакрэты стылю», які праходзіць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Ідэямі навагодняга пераўтварэння дзеліцца ўжо знаёмая чытачам і супрацоўнікам бібліятэкі імідж-стыліст Кацярына Макар, аўтар цыкла бясплатных публічных лекцый «Сакрэты стылю», якія праходзілі з красавіка да чэрвеня 2021 года.

На працягу снежня па серадах усім ахвотным зноў адкрываюцца сакрэты моднага гардэроба. Ужо прайшлі заняткі пад назвай «Пазбаўляемся ад старога — упускаем у жыццё новае». Тэмы наступных лекцый: «У чым лепей сустракаць год Чорнага Тыгра?», «Карта жаданняў. Новы імідж — новае жыццё», «Сезон "Вясна — лета 2022": модныя тэндэнцыі».

Сустрэчы праходзяць у зале дакументаў па мастацтве. Пачатак заняткаў у 15:00, уваход вольны (пры наяўнасці чытацкага білета або пропуску сацыякультурнага цэнтра).

**Яўгенія ШЫЦЬКА**